А. М. ПАЛУЯН, З. У. ШВЕДАВА
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай культуры і фалькларыстыкі,
кафедра беларускай мовы

# АБ ПРАФАРЫЕНТАЦЫЙНАЙ РАБОЦЕ НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

Сёння перад установамі вышэйшай адукацыі стаіць задача падрыхтоўкі высокакваліфікаваных, канкурэнтаздольных, прадпрымальных і актыўных спецыялістаў, запатрабаваных на рынках працы. Вядома, што якасць выпускніка напрамую звязана з якасцю прафарыентацыйнай работы, пад якой мы разумеем комплекс мер па спрыянні будучым абітурыентам у самавызначэнні, выбары аптымальнага віду заняткаў з улікам іх патрэб і магчымасцей, а таксама фарміраванне іх кампетэнтнасці пры арыентацыі і адаптацыі на рынку працы з улікам сацыяльна-эканамічнай сітуацыі.

Прафарыентацыйная работа з’яўляецца важным фактарам, які забяспечвае прываблiванне ва ўніверсітэт і на філалагічны факультэт годных абітурыентаў, акрамя таго, яна з’яўляецца адным з крытэрыяў, які вызначае якасць адукацыі. Мы маем патрэбу ў матываваных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

абітурыентах, што і з’яўляецца ключавым момантам у прафарыентацыі на нашым факультэце.

Асноўныя задачы прафарыентацыйнай работы:

- фарміраванне прафесійных інтарэсаў і ўсведамленне выбару прафесіі на раннім этапе навучання;
- арганізацыя разнастайных дадатковых адукацыйных паслуг для школьнікаў і навучэнцаў сярэдняй прафесійнай і спецыяльнай адукацыі;
- фарміраванне стабільнага кантынгенту абітурыентаў, прыцягненне найбольш адоранай часткі моладзі;
- развіццё новых праграм і тэхналогій у адпаведнасці са шматузроўневай сістэмай адукацыі;
- аказанне садзеяння ў працаўладкаванні выпускнікоў факультэта.

Прафарыентацыйная работа на факультэце праводзіцца ў адпаведнасці з планам у цесным супрацоўніцтве з факультэтам давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі, з цэнтрам тэсціравання.

Прафесійная арыентацыя ўключае:

- стварэнне сістэмы сеткавага ўзаемадзеяння з установамі агульнай і сярэдне-спецыяльнай адукацыі;
- вывучэнне і прагназаванне перспектыў фарміравання кантынгента факультэта;
- рэалізацыю прадметных падрыхтоўчых курсаў;
- рэалізацыю праграм дадатковай адукацыі.

Мэты прафарыентацыйнай работы – забеспячэнне высокага і якаснага набору абітурыентаў праз выкарыстанне найважнейшых канкурэнтных пераваг філалагічнага факультэта ГДУ імя Францыска Скарыны:

– ажыццяўленне падрыхтоўкі па такіх кірунках, як літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць і камп’ютарнае забеспячэнне філалагічнай дзейнасці;
– высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі склад факультэта;
– сучасная матэрыяльна-тэхнічная база для навучання студэнтаў (2 камп’ютарныя класы; кабінеты польскай мовы, русістыкі, вывучэння іўрыту, кітаязнаўства і да т. п.);
– насычанае і цікавае студэнцкае жыццё.

Прафарыентацыйная работа – найважнейшы фактар, які забяспечвае набор на філалагічны факультэт. Выкладчыкі факультэта праводзяць прафарыентацыйную работу ў школах г. Гомеля і Гомельскай вобласці. У рабоце выкарыстоўваюцца наступныя формы правядзення прафарыентацыйных мерапрымстваў:

- удзел у арганізацыі і правядзенні дня адкрытых дзвярэй (супрацоўнікі дэканата, загадчыкі кафедр);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

■ удзел у правядзенні экскурсій школьнікаў па ўніверсітэту і факультэту (намеснікі дэкана па вучэбнай і прафарыентацыйнай рабоце, загадчыкі кафедр, студэнцкі актыў);

■ выступленні на бацькоўскіх сходах у школах Гомеля (супрацоўнікі дэканата, выкладчыкі кафедр);

■ правядзенне і ўдзел у выязных мерапрыемствах у школах горада і вобласці (выступленне студэнцкай агітбрыгады, кароткія паведамленні аб кірунках і профілях падрыхтоўкі, умовах прыёму ва ўніверсітэт і на факультэт, адказы на пытанні – намеснікі дэкана па вучэбнай і прафарыентацыйнай рабоце, загадчыкі кафедр, студэнцкі актыў);

■ падрыхтоўка артыкулаў у газеты г. Гомеля і Гомельскай вобласці (загадчыкі і выкладчыкі кафедр);

■ абнаўленне буклетаў, факультэцкіх і кафедральных матэрыялаў для абітурыентаў на сайце (намеснікі дэкана па вучэбнай і прафарыентацыйнай рабоце, загадчыкі кафедр).

Асноўнымі кірункамі прафарыентацыйнай работы непасрэдна ў школах, ліцэях, гімназіях, каледжах з'яўляюцца:

■ прафесійнае кансультаванне (навучыць разбірацца ў змесце прафесійнай дзейнасці філолага, літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка, спецыяліста па камп'ютарнай філалогіі; суадносіць патрабаванні, якія прад'яўляюцца да названых вышэй прафесій, і індывідуальныя якасці школьніка);

■ прафесійная адаптацыя (прыцягненне школьнікаў да ўдзелу ў канферэнцыях, да напісання навуковых артыкулаў і рэфератаў, удзел у творчых конкурсах, арганізацыя сустрэч і гутарак старшакласнікаў з выкладчыкамі факультэта, вопытнымі настаўнікамі, літаратарамі, журналістамі – выпускнікамі факультэта.

Базавымі для філалагічнага факультэта з'яўляюцца гімназіі № 10, № 14 і № 36, сярэдняя школа № 66 г. Гомеля, Рэчыцкі раённы ліцэй, Рэчыцкі раённы педагагічны каледж, з якімі заключаны дагаворы аб супрацоўніцтве. Акрамя гэтага, базавымі лічым школы, у якіх праходзяць педагагічную практыку студэнты-філолагі.

Сярод асноўных канкрэтных мерапрыемстваў у межах прафарыентацыйнай работы філалагічнага факультэта неабходна адзначыць:

1) правядзенне круглых сталоў на пасяджэннях метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай і рускай моў і літаратур базавых школ і выкладчыкаў факультэта; кансультацыі настаўнікаў па пытаннях навукова-даследчай работы з вучнямі;

2) арганізацыя і правядзенне сустрэчы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, былых выпускнікоў нашага факультэта, са студэнтамі факультэта па пытаннях арганізацыі і падрыхтоўкі да педагагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

практыкі і прафарыентацыі вучняў старшых класаў да паступлення на філалагічны факультэт;

3) правядзенне студэнтамі 4–5 курсаў у час педагагічнай практыкі пазакласных мерапрыемстваў, арыентаваных на падрыхтоўку і выбар прафесіі філолага, а таксама экскурсій ва ўніверсітэт (у музей-лабараторыю Ф. Скарыны, на філалагічны факультэт і інш.);

4) выступленні выкладчыкаў філалагічнага факультэта перад настаўнікамі беларускай і рускай мовы і літаратуры на курсах павышэння кваліфікацыі УА "ГАІРА" па пытаннях прафарыентацыйнай падрыхтоўкі вучняў і школ;

5) правядзенне прафарыентацыйнай работы выкладчыкамі філалагічнага факультэта на занятках па беларускай і рускай мове на падрыхтоўчых курсах пры ГДУ імя Ф.Скарыны для здачы цэнтралізаванага тэсціравання;

6) удзел выкладчыкаў факультэта ў якасці экспертаў і членаў журы школьнай навукова-практычнай канферэнцыі "Пошук"; гарадской канферэнцыі "Свабодны выбар" сярод вучняў 7–11 класаў; абласнога конкурсу рытарычнага майстэрства "Гавары са мной па-беларуску"; навукова-практычнай канферэнцыі «Мележаўскія чытанні» на базе ДУА «Гімназія № 36 г. Гомеля імя. І. Мележа»; гімназічнай навукова-практычнай канферэнцыі вучняў "Познание мира: от научной гипотезы к открытию" ў гімназіі № 71 г. Гомеля;

7) удзел выкладчыкаў факультэта ў якасці членаў журы абласной і рэспубліканскай алімпіяд па беларускай мове і літаратуры, рускай мове і літаратуры;

8) правядзенне прафарыентацыйнай работы выкладчыкамі філалагічнага факультэта на занятках па беларускай і рускай мове з вучнямі Рэчыцкага раённага ліцэя, вучнямі "Гімназіі № 36 г. Гомеля імя І. Мележа", з адоранымі дзецьмі Добрушскага раёна на базе ДУА "Гімназія г. Добруша"; з адоранымі дзецьмі Рэчыцкага раёна на базе Рэчыцкага раённага ліцэя, з адоранымі дзецьмі Рагачоўскага раёна;

9) правядзенне заняткаў выкладчыкамі факультэта з адоранымі дзецьмі, вучнямі школ Гомеля і вобласці, пры падрыхтоўцы да абласной і рэспубліканскай алімпіяды па беларускай / рускай мове і літаратуры;

10) выступленні выкладчыкаў факультэта перад навучэнцамі школ, гімназій, ліцэяў, каледжаў г. Гомеля; удзел у правядзенні выязных сустрэч з навучэнцамі ўстаноў адукацыі Гомельскай вобласці па пытаннях прафарыентацыі;

11) удзел у on-line субяседаваннях з вучнямі школ, гімназій і ліцэяў Гомельскай вобласці па пытаннях паступлення, вучобы і размеркавання на філалагічным факультэце;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

12) падрыхтоўка і абнаўленне буклета філалагічнага факультэта; падрыхтоўка рэкламных лістоў аб умовах паступлення на філалагічны факультэт; падрыхтоўка і распаўсюджанне лістоў-запрашэнняў сярод удзельнікаў абласной алімпіяды па беларускай і рускай мовах.

РИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф